ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення
ідэалагічнай работы, культуры
і па справах моладзі
Гродзенскага аблвыканкама
А.Л.Вярсоцкі
2017г.

Парадак арганізацыі і правядзення
абласнога фестывалю народных
тэатральных калектываў
“Лідскія тэатральныя сустрэчы”

I. Мэты і задачы абласнога фестывалю народных тэатральных калектываў “Лідскія тэатральныя сустрэчы” (далей – Фестываль).

- Умацаванне ролі і папулярызацыя народных тэатраў вобласці.
- Падтрымка, стымуляванне і развіццё аматарскай творчасці.
- Удасканальванне выканальніцкага майстэрства, развіццё творчых здольнасцей удзельнікаў аматарскіх калектываў, пошук новых сцэнічных форм ажыццяўлення тэатральных пастановак.
- Пашырэнне і ўзмацненне ўплыву аматарскіх тэатраў на ўзровень эстэтычнай культуры насельніцтва.
- Далучэнне малодшага пакалення да аматарскага тэатральнага мастацтва.
- Утварэнне новых і ўмацаванне дзеючых калектываў.

II Арганізатары.

- Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама;
- ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”;
- Аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лідскага райвыканкама.

III. Парадак правядзення і ўмовы ўдзелу ў Фестывалі.

Абласны Фестываль народных тэатральных калектываў “Лідскія тэатральныя сустрэчы” праводзіцца 1 раз у два гады.

Праграма абласнога Фестывалю народных тэатральных калектываў “Лідскія тэатральныя сустрэчы” прадугледжвае ўрачыстае адкрыццё, конкурсныя прагляды, падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне дыпломамі і прызамі.

У Фестывалі прымаюць удзел лепшыя народныя аматарскія тэатральныя калектывы незалежна ад ведамаснай прыналежнасці, якія да 1 красавіка прадстаўляюць для папярэдняга прагляду спектакль альбо

відэаверсію спектакля па творах нацыянальнай ці сусветнай драматургіі на беларускай ці рускай мове працягласцю да 1 гадзіны.

У Фестывалі (па рашэнні аргкамітэта) можа прыняць удзел калектыў, які не мае найменне "народны", але з'яўляецца лаўрэатам абласнога агляду-конкурсу аматарскіх тэатральных калектываў.

З мэтай творчай вучобы на Фестываль запрашаюцца рэжысёры і загадчыкі пастановачнай часткай народных і ўзорных тэатраў, кіраўнікі лепшых тэатральных калектываў вобласці, спецыялісты раённых метадычных цэнтраў (аддзелаў) народнай творчасці і аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкамаў.

У якасці гасцей могуць быць запрошаны Заслужаныя аматарскія калектывы Рэспублікі Беларусь Гродзенскай вобласці, а таксама аматарскія тэатры з Беларусі і замежжа.

Заяўкі на ўдзел у Фестывалі і відэазапісы спектакляў дасылаюцца да 1 сакавіка на адрас: 230025, г. Гродна, ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр культуры і народнай творчасці", вул.Савецкая, 8. Кантакты: (80152) 74 03 12, 37529 5873956, тэл/факс (80152) 72 27 04; эл. адрас: onmcnt@tut.by

IV. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў Фестывалю.

Конкурсныя прагляды ажыццяўляе журы, якое вызначае і ўзнагароджвае лепшыя калектывы дыпломамі лаўрэата I, II, III ступеняў (у рамках), а таксама спецыяльнымі прызамі і дыпломамі (ў рамках) па намінацыях:

- за лепшую рэжысуру;
- за лепшае сцэнічнае ўвасабленне твораў беларускай нацыянальнай драматургіі;
- за ўдалы творчы эксперымент;
- за лепшую жаночую ролю;
- за лепшую мужчынскую ролю;
- за лепшую ролю другога плана;
- за лепшую сцэнаграфію;
- за лепшае музычнае афармленне;
- за лепшы акцёрскі ансамбль;
- за лепшы дэбют.

Астатнія калектывы ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел у Фестывалі.

Журы мае права змяняць, вызначаць дадатковыя намінацыі ў межах выдзеленнага прызавога фонду.

Лепшыя калектывы будуць прапанаваны для выступленняў на рэспубліканскіх фестывалях тэатральнага мастацтва і ўдзелу ў абласной тэатральнай акцыі "Лепшыя спектаклі аматарскіх тэатраў вобласці –

жыхарам гарадоў Гродзенскай вобласці" (кожны год для выступленняў выбіраецца пэўны горад Гродзенскай вобласці).

V. Фінансаванне.

Фінансаванне выдаткаў на правядзенне Фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў меснага бюджэту. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуецца: заработная плата членам журы, праезд старшыні журы Мінск-Ліда-Мінск, пражыванне членаў журы, прызы, дыпломы, рамкі для дыпломаў.

Для фінансавання Фестывалю могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Аплата за праезд, харчаванне ўдзельнікаў Фестывалю і суправаджаючых асоб ажыццяўляецца накіроўваючым бокам або ўдзельнікамі фестывалю.

Дадатак 3
да парадка арганізацыі і
правядзенні абласнога
фестывалю народных
тэатральных калектываў
"Лідскія тэатральныя сустрэчы"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама
. 2017 г.

**ЗАЯЎКА**
на ўдзел у абласным фестывалі народных тэатральных калектываў
"Лідскія тэатральныя сустрэчы".

1. Раён________________________________________
2. Поўная назва калектыву і базавая ўстанова дзейнасці калектыву ______________________________________________________________________________
3. Прозвішча, імя, імя па бацьку мастацкага кіраўніка калектыву, пашпартныя дадзеныя (нумар, калі і кім выданы) ______________________________________________________________________________
4. Колькасць дзеючых асоб у спектаклі (прозвішча, год нараджэння), задзейнічаных у спектаклі ______________________________________________________________________________
5. Конкурсная праграма калектыву (аўтар, назва твору, іншыя звесткі) ______________________________________________________________________________
6. Працягласць выступлення і працягласць манціроўкі дэкарацыі ________________________________________
7. Неабходныя тэхнічныя сродкі (MD, CD, раяль, мікрафоны і г.д.), светлавое абсталяванне________________________________________
8. Адрас і кантактныя тэлефоны кіраўніка ________________________________________

Подпіс кіраўніка
базавай установы ____________

Заяўкі на ўдзел у Фестывалі дасылаць да 1 сакавіка на адрас:
230025, г.Гродна, ДУК "Гродзенскі АМЦНТ", вул.Савецкая,8.
Кантактныя тэлефоны ў г.Гродна ( 80152): 74 03 12, 37529 5873956, тэл/факс (80152)72 27 04